

Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, ПРАФКОМАЎ І КАМІТЭТА ЛКСМБ
ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 12 (759) | Аўторак, 3 красавіка 1990 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

Выбары працягваюцца

НОВЫ ПРЭТЭНДЭНТ У БЕЛАРУСКІ ПАРЛАМЕНТ

На парадку дня Савета універсітэта, пасяджэнне якога праходзіла ў актавай зале 27 сакавіка, стаяла адно пытанне: аб вылучэнні кандыдата ў народныя дэпутаты БССР па Гомельскай-Цэнтральнай выбарчай акрузе № 198.

Пасяджэнне ўступным словам адкрыў сакратар парткома Г. Д. Ветлугаеў. На пачатку ён коратка расказаў аб выніках выбараў народных дэпутатаў БССР і мясцовых Саветаў, якія прайшлі 4 і 17 сакавіка г. г. Адзначана, што ад нашага універсітэта балаціраваліся: ў Вярхоўны Савет рэспублікі — 4 кандыдаты, абласны — 3, гарадскі — 7, раённы — 6. Дванаццаць прадстаўнікоў ГДУ заявавалі права ўдзельнічаць у рабоце вышэйшага органа ўлады рэспублікі і мясцовых Саветаў, вырашаць важнейшыя пытанні нашага жыцця.

Выносіцца прапанова аб выбранні ўсіх універсітэцкіх народных дэпутатаў у прэзідыум Савета, дзе яны і займаюць месцы пад апладысменты прысутных.

Аднак па раду выбарчых акруг, у тым ліку і па Гомельскай-Цэнтральнай № 198 па выбарах у Вярхоўны Савет БССР, зазначыў Г. Д. Ветлугаеў, ні першы, ні другі тур галасавання не вызначылі пераможцу. Ніхто з прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат не набраў неабходнай колькасці галасоў. Таму ў адпаведнасці з існуючым палажэннем аб'яўлена аб паўторных выбарах, назначаны іх дзень, і пачалося новае вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты. Калектыў ГДУ таксама мае права назваць свайго кандыдата, сказаў у заключэнне сакратар парткома.

На трыбуну падымаецца дэкан фізічнага факультэта дацэнт І. В. Семчанка.

— На нашым факультэце, яго кафедрах,—гаворыць Ігар Валянцінавіч,—загадзя падумалі, хто найбольш дастойны для новага вылучэння кандыдатам у народныя дэпутаты рэспублікі. І ўсе прышлі да аднаго выводу: такім чалавекам можа быць рэктар універсітэта Леанід Аляксандравіч Шамяткоў, якога ўсе мы добра ведаем як таленавітага вучонага, добрага арганізатара, патрабавальнага кіраўніка. Ён здолее ў Вярхоўным Савеце рэспублікі пастаяць за інтарэсы не толькі універсітэта, але і ўсіх выбаршчыкаў акругі.

Прапанаваную кандыдатуру ад імя кафедр грамадскіх навук падтрымаў загадчык кафедры тэорыі сацыялізму дацэнт У. І. Качаткоў.

Выступае Л. А. Шамяткоў. Спачатку ён гаворыць аб прычынах яго няўдзелу ў барацьбе за дэпутацкі мандат на асноўным этапе выбараў. Адна з галоўных — неабходнасць яму як яшчэ маладому рэктару траціць шмат часу на універсітэцкія справы, далейшае развіццё ГДУ — вядучай вышэйшай навучальнай установы рэгіёна, умацаванне яе матэрыяльна-тэхнічнай базы. Разам з тым, зазначае Леанід Аляксандравіч, ён не можа ігнараваць аказаным давер'ем і гатовы, у выпадку выбрання, з поўнай аддачай сіл выконваць дэпутацкія абавязкі.

Л. А. Шамяткоў расказаў, якой яму бачыцца далейшая перспектыва развіцця універсітэта, выкладу асноўныя палажэнні сваёй перадвыбарнай праграмы. Яна можа быць ажыццявімай, зазначыў Леанід Аляксандравіч, калі ён паўсядзённа будзе адчуваць усемагчымую падтрымку, у калектыве універсітэта не будзе разладу, а ў вырашэнні кожнага пытання праявіцца ўзаемаразуменне, мэтанакіраванасць, дзелавітасць, атмасфера творчасці і ўзаемавагі.

Л. А. Шамяткоў адказаў на зададзеныя пытанні.

Па выніках адкрытага галасавання (супраць было толькі трое) Л. А. Шамяткоў вылучаны Саветам універсітэта кандыдатам у народныя дэпутаты БССР па Гомельскай-Цэнтральнай выбарчай акрузе № 198.

Б. ВАЛОДЗІН.

НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

29-га сакавіка адбылося чарговае пасяджэнне Вучонага савета універсітэта. Прарэктар па навуковай рабоце прафесар А. М. Сердзюкоў праінфармаваў яго членаў аб падрыхтоўцы да Скарынінскіх навуковых чытанняў.

Аб арганізацыі вучэбнага працэсу на кафедрах радыёфізікі і фізічнай метралогіі зрабілі паведамленні іх загадчыкі доктар фізіка-матэматычных навук Ю. С. Ушакоў і дацэнт М. І. Аляшкевіч.

Заслуханы і абмеркаваны даклад прарэктара па завочнаму навучанню Л. Н. Сечкі аб структуры кіравання завочнай формай навучання ва універсітэце.

Адбылася прынцыповая размова аб падрыхтоўцы кадраў на спецыяльнасці «Бухгалтарскі ўлік, кантроль і аналіз гаспадарчай дзейнасці».

Зацверджана палажэнне аб Савеце НДС, рэкамендаваны работы на конкурс па распрацоўцы і ўкараненню новых тэхналогій навучання ў вышэйшай школе.

Кафедра этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму пераіменавана ў кафедру гісторыі культуры.

Вучоны савет разгледзеў кадравыя пытанні.

МУЗЕЮ — ЛЕПШЫЯ ЎМОВЫ

«Засн. у 1980. Адкрыты 15.10 1980. Агульная плошча музея 36 м²». Так пачынаецца артыкул «Археалагічны музей Гомельскага дзяржаўнага універсітэта», які змешчаны ў «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі» (т. 1, 1984, с. 177)». А вось энцыклапедыя «Этнаграфія Беларусі» (Мінск, 1989). На с. 36 змешчаны артыкул «Археалагічна-этнаграфічны музей Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны», які пачынаецца словамі: «Заснаваны ў 1980 як археалагічны. Адкрыты 15.10. 1980. Пазней створаны этнаграфічны аддзел. Агульная пл. музея 36 м²». Заўважылі розніцу? З археалагічнага музей ператварыўся ў археалагічна-этнаграфічны, а універсітэт носіць цяпер імя Ф. Скарыны. Музею хутка споўніцца 10 гадоў, і сёлета шырока адзначаецца 500-годдзе нашага вялікага першадрукара, вучонага, асветніка. Вось толькі плошча музея, нягледзячы на ўсе змены, не мяняецца. А між тым, на такой абмежаванай плошчы музей нармальна працаваць не можа. Для яго патрэбны, як мінімум, тры памяшканні: адно для археалагічнага аддзела, другое — этнаграфічнага, трэцяе — апрацоўкі экспанатаў.

Я не пісаў бы аб гэтым, калі б не адна акалічнасць: з дня на дзень чакаецца пераход гістарычнага музея ў корпус па вул. Кірава. Але ніхто не можа цвёрда абяцаць, што там для музея будуць створаны лепшыя ўмовы. Музей — гэта месца, дзе захоўваецца памяць. Дрэнна, калі шавец ходзіць без ботаў. Але куды горш, калі гісторыкі не будуць шанаваць памяць пра мінулае. Ці можа я памыляюся?

У. БАГАМОЛЬНІКАЎ,
загадчык археалагічна-этнаграфічнага музея універсітэта.

Імі ганарыцца універсітэт

Лілія марыць стаць настаўніцай, каб прывіваць дзецям любоў да роднай мовы і літаратуры. Да ажыццяўлення гэтай мары засталося не так ужо шмат. Л. Шпакоўская — на трэцім курсе філалагічнага факультэта. Вучыцца выдатна, і сёлета ёй назначана стыпендыя імя Янкі Купалы.

Гэтая сімпатычная дзяўчына — чалавек слова і справы, і пяцёркі на экзаменах для яе не самамэта. Студэнцкае жыццё дае нямала магчымасцей для развіцця сябе як асобы, і Лілія стараецца спаўна іх выкарыстоўваць: зведала, што такое праца летам у будаўнічым атрадзе, спрабуе свае здольнасці ў навуковай рабоце (неаднойчы выступала з навуковымі дакладамі на студэнцкіх канферэнцыях), захапляецца мастацкай самадзейнасцю.

Фота А. Коваля.

ВІНШУЕМ!

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў эканамічнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры эканомікі і сацыялогіі працы ЦІТОВІЧА Анатоля Антонавіча з зацвярджэннем яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата эканамічных навук.

ЗЛЁТ АКТЫВІСТАЎ СТУДАТРАДАЎ

На базе адпачынку «Рамантыкі» Гомельскага будтраста № 27 адбыўся двухдзённы XVII злёт актывістаў студэнцкіх атрадаў. Ён быў праведзены па ініцыятыве абласнога штаба студэнцкіх атрадаў і працоўных аб'яднанняў моладзі Гомельшчыны. Сярод больш чым 80 дэлегатаў злёту было і 14 прадстаўнікоў ад нашага універсітэта. У яго рабоце прынялі ўдзел Я. Казакоў з Цэнтральнага штаба студатрадаў, сакратар ЦК ЛКСМБ У. Грыдзюшка, намеснік начальніка Рэспубліканскага штаба СА М. Мятлікаў, сакратар Гомельскага АК ЛКСМБ Т. Прыман, работнікі Мінскага, Віцебскага абласных і Стаўрапольскага краявога штабаў студатрадаў.

На злёце адбылася зацікаўленая размова аб выніках працоўнага семестра-89 і задачах на новы працоўны семестр. Для ўдзельнікаў патрыятычнага руху нашай вобласці гэта размова была асабліва прыемнай. Зводны СА Гомельшчыны летась выйшаў пераможцам рэспубліканскага сацыялістычнага спаборніцтва. На злёце абласному штабу СА быў уручаны пераходны Чырвоны Сцяг Савета Міністраў БССР, Белсаўпрофа і ЦК ЛКСМБ, а таксама пераходны вымпел Дзяржадукацыі СССР і ЦК ВЛКСМ за выкананне дагаворных абавязацельстваў, 1989 г. Многія атрады і ўдзельнікі мінулагодняга працоўнага семестра, якія дасягнулі ў сваёй дзейнасці найбольш высокіх паказчыкаў, узнагароджаны граматамі камсамольскіх органаў.

У памяць аб злёце яго ўдзельнікам былі ўручаны сувеніры, вымпелы, значкі.

У заключны дзень работы злёту з канцэртам мастацкай самадзейнасці перад яго дэлегатамі выступіла агітбрыгада клуба «Маладосць» нашага універсітэта.

З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую і плённую працу па падрыхтоўцы спецыялістаў высокай кваліфікацыі, актыўны ўдзел у рабоце па камуністычнаму выхаванню студэнцкай моладзі дацэнт кафедры гісторыі СССР і БССР ЕЎДАКІМЕНКА Георгій Савіч узнагароджаны Ганаровай граматай рэктарата, парткома і прафкома універсітэта.

ДА СКАРЫНІНСКІХ НАВУКОВЫХ ЧЫТАННЯЎ

Як паведамлялася ўжо на старонках нашай газеты, сёлета адбудуцца II Скарынінскія чытанні, прысвечаныя 500-годдзю з дня нараджэння выдатнага беларускага вучонага, першадрукара і асветніка Ф. Скарыны. Вылучаныя факультэтамі і кафедрамі на конкурс работы разгледжаны аргкамітэтам і прадстаўлены ў чытальнай зале бібліятэкі галоўнага корпуса для шырокага азнаямлення і абмеркавання выкладчыкамі, супрацоўнікамі, студэнтамі і аспірантамі.

Сёння мы змяшчаем некаторыя з паступіўшых водзываў на конкурсныя работы.

Уклад у сучасную алгебру

ВЫВУЧЭННЕ любой алгебраічнай сістэмы непазбежна звязана з неабходнасцю разгляду яе падсістэм і фактарсістэм, якія валодаюць тымі ці іншымі ўласцівасцямі. Пры гэтым многія разглядаемыя ўласцівасці прама залежаць ад ведання асаблівасцей адпаведных абстрактных класаў алгебраічных сістэм. Наўрад ці хто-небудзь пачне аспрэчваць гэта палажэнне; яно можа быць праілюстравана шматлікімі «прыкладамі з жыцця» груп, кольцаў і іншых старых, класічных аб'ектаў алгебры.

Разгляд класаў з'яўляецца характэрнай рысай і агульнай тэорыі алгебраічных сістэм, шырокае развіццё якой пачалося ў 50-х гадах нашага стагоддзя. Вялікі ўклад у развіццё і прапаганду гэтай галіны ўнёс, як вядома, акадэмік А. І. Мальцаў. У дакладах на IV Усесаюзным матэматычным з'ездзе і на міжнародным кангрэсе матэматыкаў у Маскве ў 1966 г., разам з іншымі напрамкамі, А. І. Мальцаў разглядае як адну з найбольш важных тэорыю класаў алгебраічных сістэм. Класам сістэм (у прыватнасці, разнастайнасцям і квазіразнастайнасцям) прысвечаны рад работ А. І. Мальцава, а таксама значная частка яго манаграфіі «Алгебраічныя сістэмы».

Аднак многія сістэмы з умовамі канчатковасці не з'яўляюцца ні разнастайнасцямі, ні квазіразнастайнасцямі. Не з'яўляюцца імі, зразумела, і ненаследныя класы. Так, напрыклад, не з'яўляюцца разнастайнасцямі класы канечнамерных алгебр Лі, класы груп з галоўнымі радамі і інш. Пры вывучэнні алгебраічных сістэм з умовамі канечнасці (ў прыватнасці, канечных сістэм) ёсць сэнс выкарыстаць класы «падобныя» на разнастайнасці, але неабавязкова наследныя і неабавязкова замкнутыя адносна бясконцых дэкартавых здабыткаў. Такімі як раз з'яўляюцца фармацыі, якім прысвечана кніга «Фармацыі алгебраічных сістэм» Л. А. Шамяткова і А. М. Скібы.

Фармацыя груп — гэта клас груп, замкнёны адносна ўзяцця гамаморфных вобразаў і канечных паддэкартавых здабыткаў (як звычайна, канечны здабытак — гэта здабытак з канечным лікам множнікаў). Зразумела, што гэты здабытак можна пашырыць і гаварыць аб фармацыях кольцаў, алгебр Лі і г. д. Але ўсё ж да канца 70-х гадоў эпіцэнтр тэорыі фармацый ляжаў у межах тэорыі канечных груп.

Пераломным стаў 1978 год. Менавіта ў гэтым годзе была апублікавана манаграфія Л. А. Шамяткова «Фармацыі канечных груп», якая падвяла вынікі папярэдняга развіцця, і з гэтага ж года ў ГДУ пачаў працаваць семінар па агульнай тэорыі фармацый алгебраічных сістэм.

Да цяперашняга часу накоплены дастаткова змястоўны і багаты ў ідэйным плане матэрыял, які дазваляе гаварыць аб афармленні тэорыі фармацый у самастойны напрамак агульнай алгебры.

Прапаноўваемая кніга з'яўляецца першай у сусветнай літаратуры спробай выкладання агульнай тэорыі фармацый алгебраічных сістэм. Аўтарам удалося ліквідаваць паралелізм паміж радамі матэматычных тэорый. У кнізе вялікая ўвага ўдзелена развіццю агульных метадаў даследавання алгебраічных сістэм. Выяўлена глыбокая сувязь паміж тэорыяй фармацый і тэорыяй разнастайнасцей. У цэлым кніга з'яўляецца вялікім укладам у сучасную алгебру.

У. СЕМЯНЧУК,
загадчык кафедры вышэйшай матэматыкі.

ЖАНР ТАЯМНІЧЫ І НЕЗВЫЧАЙНЫ

Балада — адзін з самых таямнічых і загадкавых жанраў сусветнай паэзіі. У іерархіі паэтычных жанраў ва ўсе часы ён займаў сваё адметнае месца, бо вылучаўся тэматыкай, вобразна-выяўленчай сістэмай, нечаканасцю сюжэтных хадоў. Ці не таму ён стаў улюбёным у творчасці найбольш славутых еўрапейскіх паэтаў. Дастаткова згадаць імёны Л. Бюргера, Г. Гейне, І.-В. Гётэ, Ф. Війона, Г. Апалінэра, А. Міцкевіча, Х. Боцева. Кожны з нас з дзяцінства памятае радкі са славутай «Святланы» В. Жукоўскага ці гісторыю слаўнага князя Алега, напісаную рукою вялікага Пушкіна.

Беларуская балада мае таксама багатыя традыцыі. Дастаткова ўспомніць творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, «Герой» П. Панчанкі, «Цвёрда трымаўся юнак на дапросе», «Балада аб чатырох заложніках» А. Куляшова, філасофскія балады Ул. Караткевіча, арыгінальную ва ўсім славянскім свеце кнігу «Веча славянскіх балад» Я. Сіпакова. Але да апошняга часу гэты цікавы і незвычайны жанр не быў даследаваны ў беларускім літаратуразнаўстве.

Манатрафія І. Ф. Штэйнера «Беларуская балада. Вытокі жанру і паэтычная структура» якраз і запаўняе гэты прабел. У гэтай кнізе пастаўлены і вырашаюцца многія тэарэтычныя і практычныя задачы. Даследчык вызначае жанравыя асаблівасці балады, адзначае яе жанравыя межы ў параўнанні з іншымі творамі беларускай паэзіі. Ён прасочвае гісторыю зараджэння і станаўлення беларускай балады ад першых твораў да яе класічных узораў пачатку XX ст. Прычым гэты складаны і супярэчлівы працэс паказаны на шырокім фоне развіцця еўрапейскай, у першую чаргу, славянскай балады. Цікавымі ўяўляюцца назіранні над тым, як у гэтым працэсе ўзаемадзейнічалі нацыянальна-самабытныя, перш за ўсё фальклорныя, і літаратурныя традыцыі. На матэрыялах паэтычнай творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча паказваецца, як у працэсе эвалюцыі складвалася форма балады, пашыраліся яе жанравыя магчымасці.

Таму даследаванне І. Ф. Штэйнера з'яўляецца вельмі актуальным і карысным. Кнігу з цікавасцю прачытаюць студэнты-філолагі, бо тут шмат звестак з тэорыі літаратуры, мастацкага фальклярызму, па-новаму раскрываюцца многія з'явы роднай літаратуры; настаўнікі, бо многія балады вывучаюцца ў школе; літаратуразнаўцы, асабліва тыя, хто захапляецца славістычнымі праблемамі; шматлікія прыхільнікі роднага слова.

У. САБАЛЕНКА,
загадчык кафедры рускай літаратуры.

ПА ПРАБЛЕМАХ ЭЛЕМЕНТАРНЫХ ЧАСЦІНАК

Адна з цэнтральных праблем квантавай тэорыі поля — праблема звязаных станаў часцінак. Так, па сучасных уяўленнях адроны — часцінкі, якія раней лічыліся элементарнымі, цяпер элементарнымі толькі называюцца, таму што на самой справе яны складаюцца з кваркаў. Тэорыя ўзаемадзеяння кваркаў — квантавая хромадынаміка — найбольш бурна развіваемая ў апошні час галіна фізікі элементарных часцінак. Асноўнай у гэтай тэорыі з'яўляецца праблема апісання ўласцівасцей адронаў на падставе ўяўлення аб іх састаўной прыродзе. Аналагічная праблема існуе ў квантавай электрадынаміцы — тэорыі электрамагнітных узаемадзеянняў часцінак, і ў іншых тэорыях поля.

Для апісання звязаных станаў элементарных часцінак у квантавай тэорыі поля быў выведзены шэраг ураўненняў. Даследаванню гэтых ураўненняў прысвечаны цыкл работ В. М. Капшая. Гэтыя ўраўненні шырока прымяняліся і раней, але нават у найбольш простых выпадках яны аказваліся настолькі складанымі, што іх дакладныя рашэнні знайсці не ўдавалася. Але якраз гэта было вельмі прывабным, таму што ў дакладным рашэнні ўтрымліваецца ўся інфармацыя аб звязаной сістэме. Праблема ўскладнялася яшчэ і тым, што асноўная велічыня падыходу — аператар узаемадзеяння складаючых звязаной сістэмы — павінен знаходзіцца вельмі складаным шляхам, так што ён быў вядомы толькі прыкладна.

Упершыню ў навуковай літаратуры дакладна аператар узаемадзеяння звязанай сістэмы быў знойдзены на аснове паслядоўнага прымянення метадаў квантавай тэорыі поля ў работах прадстаўленага цыклу. Спачатку гэта было зроблена ў прасцейшым выпадку дзвюх бесспінавых часцінак, потым метад быў абагулены на выпадак часцінак з ненулявым спінам. У якасці пераносчыкаў узаемадзеянняў пры гэтым былі разгледжаны розныя магчымасці — ад прасцейшых скалярных да калібровачных базонаў. Пазней гэтыя вынікі былі абагулены на выпадак многачасцінкавых, напрыклад, многакваркавых сістэм.

Веданне яўнага віду ўзаемадзеяння дазволіла аўтару перайсці да другой асноўнай задачы тэорыі — знаходжання рашэнняў інтэгральных ураўненняў. У тым выпадку, калі такое ўраўненне ўдаецца рашыць дакладна, адкрываюцца шырокія магчымасці для апісання працэсаў узаемадзеяння элементарных часцінак з іншымі аб'ектамі і палямі. Дык вось, у цыкл работ, які мы зараз абмяркоўваем, таксама ўпершыню ў літаратуры, знойдзен цэлы шэраг дакладных рашэнняў памянёных ураўненняў. Больш таго, аўтарам цыкла распрацаваны шэраг метадаў рашэння гэтых ураўненняў.

Атрыманыя ў работах цыкла вынікі дазволілі растлумачыць адзін нядаўна адкрыты зусім нечаканы эфект — існаванне вузкіх рэзанансаў у электрон-пазітронных сістэмах.

Работы абмяркоўваемага цыкла неаднойчы дакладваліся на міжнародных і ўсесаюзных канферэнцыях і атрымалі шырокае прызнанне навуковай грамадскасці. Неабходна таксама адзначыць, што вынікі навуковых даследаванняў укаранёны ў вучэбны працэс у спецкурсы спецыялізацыі «Тэарэтычная фізіка».

М. МАКСІМЕНКА,
загадчык кафедры тэарэтычнай фізікі.
А. АФОНІН,
дацэнт кафедры.

ВАЖНЫ ДАПАМОЖНІК

Кніга М. А. Дзмітрыева «Тэорыя адукацыі і навучання», якая выйшла летась у выдавецтве «Універсітэцкае», стала важным вучэбна - метадычным дапаможнікам для студэнтаў ВНУ педагагічнага профілю і навучэнцаў педвучылішчаў. У бягучым навучальным годзе гэты дапаможнік выкарыстоўваецца ў нашым педвучылішчы і атрымаў у выкладчыкаў і будучых педагогаў добры водзыў.

Складаныя тэарэтычныя палажэнні адукацыі і навучання аўтар кнігі выкладае ў даступнай форме для разумення навучэнцамі. Прыведзена шмат прыкладаў, якія раскрываюць сістэму работы педагогаў-навацараў, педагогаў-падзвіжнікаў усіх часоў.

У агульнай сістэме падрыхтоўкі педагагічных кадраў манаграфія М. А. Дзмітрыева адпавядае задачы падрыхтоўкі творчай асобы настаўніка. Акрамя тэарэтычнага матэрыялу ў ёй змешчаны пытанні для самастойнай працы па аволоданню асновамі дыдактыкі, практычнымі вучэннямі і неабходнымі навыкамі.

Праблемы сучаснай дыдактыкі як тэорыі адукацыі і практыкі навучання раскрываюцца ў святле марксісцка-ленінскага вучэння аб выхаванні і адукацыі, у напрамку патрабаванняў сярэдняй школы ў сучасных умовах.

В. СІДАРЭНКА,
намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Гомельскага педвучылішча.

ДЛЯ ПРАКТЫЧНАГА ПРЫМЯНЕННЯ

У існуючых інструментальна-базавых сістэмах аўтаматызацыі сродкі ацэнкі якасці распрацоўваемых пакетаў прыкладных праграм (ППП). Для ацэнкі якасці пакетаў неабходна правядзіць як статычныя, так і дынамічныя вымярэнні. Аднак сродкі дынамічнага вымярэння праграм у рамках ОС ЕС развіты недастаткова, што абумоўлена складанасцю дынамічнага вымярэння і цяжкасцямі прывязкі вынікаў вымярэння да тэкстаў праграм. Існуючыя вымяральныя сродкі або дазваляюць атрымаць толькі інтэгральныя характарыстыкі праграм, або недастаткова тэхналагічныя. Адсутнасць тэхналагічных вымяральных сродкаў і методык іх прымянення ва ўмовах прамысловай вытворчасці праграмнага забеспячэння істотна зніжае эфектыўнасць распрацоўкі ППП, якія павінны быць высокаякаснымі праграмнымі прадуктамі. Таму актуальнай з'яўляецца праблема распрацоўкі эксперыментальных метадаў і праграмных сродкаў даследавання ППП, а таксама сродкаў іх генерацыі з устроеныі сродкамі вымярэння.

Рэсурсная і іерархічная мадэль ППП, распрацаваная П. П. Эдзігерам, адрозніваецца ад існуючых мадэляў тым, што, па-першае, дазваляе апісваць граф ППП пры наяўнасці рэкурсій, і, па-другое, утрымлівае характарыстыкі розных тыпаў рэсурсаў. Апісанне графа пры наяўнасці рэкурсіі магчыма за кошт выкарыстання дрэвападобнага ўяўлення мадэлі. Розныя тыпы рэсурсаў апісваюцца адзінымі спосабам з дапамогай лагічных палімонаў.

П. П. Эдзігерам прапанаваны метад іерархічнай камплектацыі пакетаў, які заснаваны на прадстаўленні праблемнай вобласці ППП з дапамогай мноства іерархічна ўпарадкаваных графаў. Такі падыход істотна спрашчае камплектацыю ППП з наяўных праблемных модуляў і сістэмных графаў, апісваючых фрагменты праблемнай вобласці. Для даследавання ППП прапанавана выкарыстаць частотны і функцыянальны метады. Частотны метад адрозніваецца ад існуючых аналагаў спосабам прывязкі вынікаў вымярэнняў да аператараў праграмы, які забяспечвае моўную незалежнасць метада. Функцыянальны метад адрозніваецца ад аналагаў спосабам інструментавання (падрыхтоўкі да вымярэння). Інструментаванне ажыццяўляецца на ўзроўні загрузачных модуляў, што выключае неабходнасць ператрансляцыі і перарадагавання праблемных модуляў для правядзення вымярэння.

Па праблематыцы распрацоўкі і даследавання ППП П. П. Эдзігерам апублікавана 17 навуковых прац. Іх вынікі ўкаранёны ў пяці арганізацыях. Сумарны эканамічны эфект склаў 90 тыс. руб.

А. КАМОРНІКАЎ,
ст. выкладчык кафедры матэматычных праблем кіравання.

На Вучоным савеце універсітэта, пасяджэнне якога адбылося 29 сакавіка, прынята рашэнне аб правядзенні навуковых Скарынінскіх чытанняў у ГДУ ў перыяд з 24 па 26 мая, калі ў нашай рэспубліцы і за яе межамі ў рамках ЮНЕСКА будзе шырока адзначацца 500-годдзе з дня нараджэння Ф. Скарыны.

КАМСАМОЛУ ЗАСТАЛІСЯ ВЕРНЫМІ

20 сакавіка г. г. на філалагічным факультэце была праведзена акцыя, заснаваная на добраахвотных пачатках: дзень свабоднага выхаду з камсамола. Нарэшце, думаю, дэмакратыя ўзяла верх. Але, як высветлілася, на філфаку ні адзін білет членам ВЛКСМ не быў пакладзены. Чым гэта растлумачыць? Вялікай любоўю да камсамола? Не, не думаю, таму што на ўласныя вушы чуў, і не ад аднаго чалавека ва універсітэце: «Я першая пакладу камсамольскі білет!».

Можа тут было пачуццё страху? Але страх — гэта стан, уласцівы толькі жывёлам. Хутчэй за ўсё, гэта была няўпэўненасць у заўтрашнім дні. Хто ведае, можа вернуцца старыя часы, уваскрэсне са свайго праху «бацька народаў» і паўторыцца 37-ы год?

А можа, маладым людзям цікава ў камсамоле? Наўрад ці. У адзін дзень усіх камсамольцаў філалагічнага факультэта вызвалілі ад заняткаў для правядзення камсамольскай канферэнцыі. Але на яе прыйшло толькі крыху больш ста чалавек. А філалагічны ж факультэт самы шматлікі па колькасці студэнтаў ва універсітэце.

Можа, маладым людзям цікава зусім іншае: тэатр, інсцэніроўкі, прысвечаныя адраджэнню беларускай мовы або добрай прафесіі настаўніка? Не, і гэта не так. Зноў такая ж невялікая колькасць прысутных у зале. Дык што ж тады цікавіць студэнта? Канешне, дыскатэка. Хаця і гэта нядрэнна. І навошта некуды ісці, калі ёсць прадстаўніцы супрацьлеглага полу і з імі можна няблага правесці час.

Пасіўнасць у камсамоле — гібель камсамола. Таварышы камсамольцы! Я звяртаюся менавіта да вас. Вы павінны вырашыць, які саюз нам патрэбен. Саюз, на маю думку, павінен быць добраахвотным. Усе, хто ўваходзяць у яго, абавязаны прыйсці адзін аднаму на дапамогу, калі здарылася бяда. Не будзем далёка хадзіць за прыкладамі, успомнім Чарнобыль.

Падумайце над гэтым, таварышы!

А. КАЦАПАЎ,
студэнт гр. Б-14
філалагічнага факультэта.

АД РЭДАКЦЫІ: у сваім допісе А. КАЦАПАЎ закрануў вельмі важную праблему. Хацелася б, каб па ёй на старонках нашай газеты выступілі іншыя студэнты, актывісты камсамола.

Экскурсія замежных студэнтаў

АДКРЫЛІ СВЕТ МАСТАЦТВА

У СЯГО дзесяць месяцаў знаходзяцца студэнты з Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам на вучобе ў Савецкім Саюзе. І за гэты кароткі тэрмін яны імкнуцца не толькі паглыбіць веды па рускай мове, але і бліжэй пазнаёміцца з культурай і традыцыямі народаў нашай краіны. Такой мэтанакіраванасці і энергіі іншаземцаў можна пазайздросціць, асабліва, калі бачыш інертнасць і абыякавасць нашай моладзі да сваіх вытокаў.

У адзін з сонечных сакавіцкіх дзён в'етнамскія студэнты зрабілі экскурсію ў музей народнай творчасці г. Веткі. Паездцы папярэднічала ўважлівае вывучэнне мінулага горада, яго гісторыка-культурных асаблівасцей. Экскурсія лагічна завяршыла вывучэнне в'етнамцамі лінгвакраіназнаўчай тэмы «Творчасць народаў СССР». Студэнты адкрылі для сябе новы, неспазнаны свет дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Старажытныя кнігі і рукапісы, прадметы быту нашых продкаў, унікальныя экземпляры веткаўскай іканапіснай школы ўразілі іх ўяўленне. Кульмінацыяй экскурсіі стала наведанне выстаўкі нацыянальнай вышыўкі. Залатыя рукі беларускіх майстроў зрабілі цуд: іх работамі (сапраўднымі творамі мастацтва) захапляюцца людзі ўсіх нацыянальнасцей. Бо сапраўдны росквіт культуры любога народа немагчымы без захавання традыцый пакаленняў. І ў гэтым неацэнную дапамогу аказвае веткаўскі музей.

С. КАШАВЕЦ,
Н. ДЗВІНКОЎСКАЯ,
выкладчыцы кафедры рускай мовы для замежных навучэнцаў.

ДНІ ДРУЖБЫ-90

Вясна для членаў КІДа «Саюз» нашага універсітэта — вельмі клапатлівая пара. Мы прымаем ў сябе гасцей, якія прыязджаюць у горад над Сожам на традыцыйныя «Дні дружбы».

Сёлета мы рады былі сустракаць 13 дэлегацый студэнтаў з 12 ВНУ краіны. Прыемна адзначыць, што ўпершыню да нас прыехалі кідаўцы з гарадоў Шуя, Волагда, Кіраў, Алма-Ата, Цалінаград, Віцебск.

На працягу чатырох дзён мы знаёмілі гасцей з універсітэтам, работай нашага клуба, выдатнымі мясцінамі г. Гомеля. Вельмі цікавай атрымалася экскурсія ў абласны краязнаўчы музей. У гэты ж дзень на вечары беларускай культуры студэнткі філфака і гістфака спявалі гасцям народныя песні, прыпеўкі, паказалі беларускія абрады. Нашы госці не былі пасіўнымі сузіральнікамі, а таксама актыўна ўключыліся ў дзеянне, спявалі і танцавалі. Незабыўныя ўражанні засталіся ва ўдзельнікаў «Дзён дружбы» пасля экскурсіі ў музей народнай творчасці г. Веткі, сустрэчы з групай веруючых. А вясёлы і цікавы КВЗ надоўга пакінуў ва ўсіх яго ўдзельнікаў выдатны настрой.

НА ЗДЫМКАХ: (уверсе) імправізаваны канцэрт пасля вяртання з музея г. Веткі; (унізе) казахскі вальс выконваюць госці з Алма-Аты К. Ергаліева і А. Куанышава.

А. КОВАЛЬ,
прэзідэнт КІДа «Саюз».

У прафкоме

ПЕРШАЕ СЛОВА— ЗА ФАКУЛЬТЭТАМІ

Сёння пытанне насычэння таварамі спажывецкага рынку стаіць надзвычай востра. У спіс дэфіцытных трапілі нават тыя, якія раней свабодна ляжалі на прылаўках магазінаў. Што ж датычыць легкавых аўтамашын, якія людзі жадаюць набыць у прыватнае карыстанне, то яны ўжо даўно адносяцца да разраду востра дэфіцытных. Колькасць жадаючых мець уласны транспарт, аднак, не змяншаецца, а павялічваецца.

Шмат тых, хто марыць стаць уладальнікам «Жыгулёў» ці «Масквіча», ёсць і сярод выкладчыкаў, супрацоўнікаў нашага універсітэта. Аб гэтым сведчыць вялікая колькасць заяў аб выдзяленні аўтамашын, пададзеных у прафком ГДУ. Зразумела, што задаволіць патрэбы ўсіх жадаючых вельмі складана, калі ўлічыць, што аблвыканком выдзяляе ў год універсітэту толькі некалькі аўтамабіляў. Не трэба быць вельмі моцным у матэматычных разліках чалавекам, каб падлічыць, калі пры такіх акалічнасцях можна стаць шчаслівым уладальнікам аўтамашыны. Хтосьці ўсё ж цярпліва чакае, іншыя ж, як кажуць, шукаюць усе хады і выхады, каб гэту падзею паскорыць. Адны прыходзілі да рэктара з просьбай падпісаць заяву-хадайніцтва ў аблвыканком на выдзяленне ім аўтамабіляў. Другія знаходзілі іншыя шляхі. А ў канчатковым выніку, калі і тым, і другім удавалася купіць машыну, іх набыццё залічвалася на рахунак універсітэта.

Цяпер жа прафсаюзны камітэт спрабуе выпрацаваць тыя крытэрыі, згодна якіх выкладчыкам, супрацоўнікам ГДУ могуць быць выдзелены легкавыя аўтамабілі. Аб першай з такіх спроб паведамлялася ўжо на старонках універсітэцкай газеты ў верасні мінулага года ў артыкуле «Без недамован». Праўда, выклікала яна ў калектыве неадназначную ацэнку, чаму пасадзейнічала прыкрая памылка (на пасяджэнні прафсаюзнага камітэта дзялілі тое, чаго не было ў наяўнасці, як кажуць, шкуру незабітага мядзведзя). Памылка гэтая адбылася не па віне прафкома.

Нядаўна ж яго члены сумесна з адміністрацыяй універсітэта сабраліся на сваё пасяджэнне, каб вырашыць, каму на гэты раз размеркаваць выдзеленую універсітэту аўтамашыну маркі ВАЗ-21063. Напярэдадні аб маючым адбыцца яе размеркаванні прафком паведаміў на кожны факультэт, каб на сходах іх калектывы былі вызначаны кандыдатуры на яе атрыманне (колькасць гэтых кандыдатур залежыла ад колькасці членаў калектыву). Так, ад фізічнага, матэматычнага, эканамічнага, філалагічнага факультэтаў на сходах былі вызначаны па 2 прэтэндэнты, факультэта фізічнай культуры — 1, кафедры педагогікі і псіхалогіі — 2, кафедр грамадскіх навук — 1, Савета ветэранаў універсітэта — 1. Вялікі на факультэцкім сходзе замест адной кандыдатуры вылучылі тры, таму на пасяджэнні прафкома было прапанавана перагледзець на факультэце прадстаўлены спіс і, на свой погляд, пакінуць у ім толькі аднаго чалавека. Астатнія факультэты спісы ў прафком не падалі, хаця ім аб гэтым было аб'яўлена.

Такім чынам, атрымаўся спіс прэтэндэнтаў на аўтамашыну з 15 чалавек, які і быў зацверджаны на пасяджэнні прафсаюзнага камітэта і адміністрацыі (з улікам паправак з біяфака).

З зацверджанага спісу на пасяджэнні прафкома яго членамі былі прапанаваны на выдзяленне аўтамабіля маркі ВАЗ-21063 наступныя кандыдатуры: Г. В. Саннікава, А. М. Сердзюкоў, У. С. Сідараў, А. С. Калугін, М. В. Родчанка. Пры адкрытым галасаванні большасць галасоў была аддадзена А. М. Сердзюкову.

Згодна гэтага спіса рэктар ГДУ Л. А. Шамяткоў будзе хадайнічаць перад аблвыканкомам аб максімальным задавальненні патрэб універсітэцкага калектыву ў аўтамашынах на бягучы год.

Т. ДУБЯК.

Па слядах нашых выступленняў

«КАМУ ГЭТА ТРЭБА?»

Пад такім загалоўкам ў № 5 ад 13 лютага ў газеце «Гомельскі універсітэт» была змешчана рэпліка студэнткі завочнага факультэта Г. Тарапына. Размова ішла аб тым, што ў час зімовай сесіі студэнтам-завочнікам ва універсітэце не заўсёды ствараюцца належныя ўмовы для заняткаў. У прыватнасці, у другую змену не працуе гардэроб, што прыносіць студэнтам дадатковыя клопаты з іх верхнім адзеннем. А гэта, як паказала практыка, можа закончыцца для некаторых завочнікаў непрыемнасцю — прапажай асабістых рэчаў.

Гаварылася таксама аб тым, што са студэнтаў-завочнікаў работнік аддзела ўнутраных спраў браў пісьмовыя абавязацельствы здаваць сваё адзенне ў гардэроб, каб не хвалявацца за яго захаванасць. У заметцы выказвалася думка, што такая форма прафілактыкі крадзяжоў рэчаў студэнтаў ГДУ сябе не апраўдвае.

Рэдакцыя газеты звярнулася за тлумачэннямі ў аддзел унутраных спраў Цэнтральнага раёна г. Гомеля. Вось які адказ яна атрымала ад яго начальніка Л. М. Ефіменкі: «На надрукаваную заметку «Каму гэта трэба?» паведамляем, што аналіз крадзяжоў асабістай маёмасці грамадзян у раёне паказвае, што даны від злачынстваў прымае катастрафічны характар. У асноўным, пераважаюць крадзяжы з незачыненых кабінетаў, аўдыторый, знікаюць пакінутыя без нагляду асабістыя рэчы і г. д. Таму было прынята рашэнне актывізаваць прафілактычную работу па папярэджванню крадзяжоў. Акрамя таго, было ўстаноўлена, што ў большасці выпадкаў крадзяжам садзейнічалі халатныя адносіны грамадзян да захаванасці сваіх асабістых рэчаў. Прымаючы ўсё гэта пад увагу, і была арганізавана ва ўстановах, на прадпрыемствах работа па папярэджванню такіх злачынстваў.

Адным з відаў прафілактыкі крадзяжоў асабістай маёмасці грамадзян і было ўручэнне памятак-абавязацельстваў, каб перасцерагчы іх, яшчэ раз нагадаць ім аб належнай захаванасці сваіх рэчаў. У той жа час аддзел унутраных спраў не ставіў мэту застрахаваць сябе ў выпадку здзяйснення крадзяжу, і згодна закона ў кожным такім выпадку ён будзе праводзіць разбор і расследаванне».

Гэта адзін бок праблемы. Тут усё ясна. А як жа студэнту-завочніку забяспечыць захаванасць сваіх рэчаў, калі гардэроб не працуе?

— Катастрафічна не хапае людзей для работы ў гардэробах універсітэта, — тлумачыць прарэктар па АГР П. М. Навуменка. — Думаю, праблему можна было б вырашыць з дапамогай самих студэнтаў. Яны могуць працаваць у іх на паўстаўкі, і ім ёсць магчымасць палепшыць сваё матэрыяльнае становішча.

Удакладненне

У папярэднім нумары нашай газеты на другой старонцы быў змешчаны фотарэпартаж «Прайшло размеркаванне і хутка развітанне». Па віне аўтара здымкаў А. Коваля дапушчана недакладнасць. На адным са здымкаў — выпускніца фізічнага факультэта спецыялізацыі «Фізічная электроніка» Аляксандр Фрунчак, а не Ігар Працевіч, як гэта было напісана.

Рэдакцыя просіць прабачэння за недакладнасць.

7-га КРАСАВІКА— СУСВЕТНЫ ДЗЕНЬ ЗДАРОЎЯ ПАД ДЭВІЗАМ:

НАША ПЛАНЕТА — НАША ЗДАРОЎЕ, ДУМАЙ ГЛАБАЛЬНА — РАШАЙ ЛАКАЛЬНА

ІНФАРМАЦЫЙНЫ ВЫПУСК № 2 АБЛАСНОГА ЦЭНТРА ЗДАРОЎЯ

КЛОПАТ КОЖНАГА

Гомельская вобласць валодае значным прамысловым патэнцыялам і, натуральна, як і ва ўсіх прамыслова развітых рэгіёнах краіны праблемы аздараўлення навакольнага асяроддзя з'яўляюцца адным і з самых вострых.

У паветраны басейн штогод выкідваецца звыш 200 тыс. т розных шкодных рэчываў. У адкрытыя вадаёмы трапляюць мільёны кубічных метраў вытворчых і гаспадарча-фекальных сцёкавых вод, у тым ліку і значная колькасць недастаткова ачышчаных.

Для павышэння ўраджайнасці і барацьбы са шкоднікамі раслін штогод расходуюцца тысячы тон мінеральных угнаенняў і сотні — хімічных сродкаў. Бескантрольнае, а, бывае, ненарміраванае іх выкарыстанне прыводзіць да забруджвання сельскагаспадарчай прадукцыі ядахімікатамі і значнага перавышэння нітратаў і ядахімікатаў.

Адмоўны ўплыў пералічаных фактараў на арганізм чалавека ўзмацняецца ў нашай вобласці радыяцыйнай абстаноўкай. Найбольш востра экалагічныя праблемы праяўляюцца ў г. Гомелі, Светлагорску, Рэчыцы, Мазырскім прамвузле. У апошнія гады ўскладняецца экалагічная абстаноўка ў г. Жлобіне, дзе дзейнічае і працягвае пашырацца Беларускі металургічны завод.

У г. Гомелі найбольш масіўнымі крыніцамі забруджвання атмасфернага паветра з'яўляюцца буйныя прамысловыя прадпрыемствы і аб'яднанні: ВА «Гомсельмаш», «Эмальпасуда», «Гомельдрэў», заводы «Цэнтраліт», «Гомелькабель», хімзавод і інш.

Канцэнтрацыя ксілолу і талуолу ў зоне жыллёвай забудовы, якая прылягае да фарбавальных цэхаў ВА «Гомсельмаш», перавышае гранічна дапушчальныя нормы ў асобных выпадках у 10—15 і больш разоў. У пачатку сакавіка г.г. па заяве жыхароў была праверана і спынена работа фарбавальнага цэха № 1, таму што парушалася тэхналогія і канцэнтрацыя ксілолу была надзвычай высокай.

Вытворчасць ВДА «Гомельдрэў» забруджвае атмасферу ацэтонам, фармальдэгідам і іншымі растваральнікамі. Прычым іх канцэнтрацыя таксама значна перавышае дапушчальную.

Адной з праблем, якія патрабуюць рашэння, з'яўляецца забруджванне атмасфернага паветра адпрацаванымі газамі аўтамабіляў, доля якіх у агульных выкідах у г. Гомелі складае звыш 50%.

На арганізм чалавека аказваюць уплыў не толькі знешнія фактары. Асаблівае значэнне мае рацыянальнае харчаванне і экалагічна чыстыя якасныя прадукты. Пры папярэднім аналізе прычын высокага ўтрымання нітратаў у вадзе калодзежаў і гароднінай прадукцыі адзначаецца залежнасць ад ступені прымянення азоцістых угнаенняў. Перавышэнне нітратаў у гародніне вышэй устаноўленых нарматываў для БССР складае да 30% (даныя выбарачнага кантролю СЭС), а ў калодзежнай вадзе адзначаюцца выпадкі перавышэння ў 2—5 разоў. Астаткавыя колькасці ядахімікатаў, па даных лабараторных даследаванняў санітарнай службы і аграпрома, у раслінаводчай прадукцыі складаюць ад 2 да 12%. Па ўпарадкаванню прымянення азоцістых угнаенняў і кантролю за ўтрыманнем нітратаў у прадуктах харчавання выдадзен загад аблаграпрома. Аблвыканкомам разглядаецца пытанне і аб значным абмежаванні і ўпарадкаванні прымянення хімічных сродкаў аховы раслін.

Які ж ўплыў пералічаныя фактары аказваюць на стан здароўя насельніцтва?

- Розныя навукова-даследчыя інстытуты, якія праводзілі даследаванні ў гарадах з развітай прамысловасцю, адзначаюць значную залежнасць здароўя насельніцтва ад стану навакольнага асяроддзя. Па даных аўтаматызаванай інфармацыі сістэмы (АГІС) «Здароўе», якая працуе ў Гомелі, ва ўмоўна забруджанай зоне г. Гомеля ў параўнанні з умоўна чыстай зонай горада агульная захворванне насельніцтва ў 1,5 раза вышэйшае.

Камісіямі Міністэрства аховы здароўя БССР, якія працавалі ў 1989 г. у г. Мазыры і г. Светлагорску па разгляду скаргаў насельніцтва на дрэнныя экалагічныя ўмовы, адзначана тэндэнцыя росту захворванняў дарослага і дзіцячага насельніцтва па большасці назалагічных адзінак. Прычым, прамой залежнасці ад уводу вытворчых магутнасцей не зафіксавана, але адзначана тэндэнцыя павелічэння захворванняў пры тых жа ўмовах, што і для іншых гарадоў Беларусі.

Пагаршэнне экалагічнай абстаноўкі разам з іншымі неспрыяльнымі фактарамі можа аказаць істотны ўплыў на стан здароўя насельніцтва.

Як жа рашаюцца праблемы экалогіі ў вобласці? Ажыццяўляецца жорсткі кантроль за работай ачышчальных збудаванняў на дзеючых прадпрыемствах. Ніводнае прадпрыемства не атрымлівае дазволу на пашырэнне і рэканструкцыю без зніжэння выкідаў шкодных рэчываў. Праекты падвяргаюцца экалагічнай экспертызе. Так, напрыклад, праект санітарна-ахоўнай зоны Мазырскага прамвузла, распрацаваны па заказу Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода, накіраваны на пазаведамасную экалагічную экспертызу пры АН БССР. Прыпынена будаўніцтва 2-й чаргі Светлагорскага ЦБЗ да вырашэння пытання па рэзкаму зніжэнню выкідаў і іх уплыву на насельніцтва. У 1989 г. укаранена ў эксплуатацыю ўстаноўка па ачыстцы адыходзячых газаў Светлагорскага ВА «Хімвалакно» ад серавугляроду. Агульны кошт устаноўкі—звыш 12 млн. руб. У бягучым годзе павінна быць закончана перасяленне жыхароў в. Міхалкі, якая знаходзіцца ў санітарна-ахоўнай зоне Мазырскага завода кармавых дражджэй.

Па патрабаванню абласной санэпідстанцыі строга рэгламентавана работа фарбавальных цэхаў ВА «Гомсельмаш». Вырашана пытанне аб ліквідацыі ліцейных ваграна́к з іх дэмантажом і пераводзе вытворчасці пасуды на штампоўку ў ВА «Белэмальпасуда». Перад кіраўнікамі прадпрыемстваў пастаўлена задача па рашэнню пытанняў укаранення малаадыходных і безадходных тэхналогій.

А. ДАЦЭНКА,
загадчык санітарна-гігіенічнага аддзела абласной санэпідстанцыі.

Сацыёлаг пытаецца ВАШ ПРАГНОЗ

ЭКАЛАГІЧНАЯ КАТАСТРОФА... — ЦІ МАГЧЫМА ЯНА НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ?

КЛЮЧАНОВІЧ В. І. — галоўны ўрач абласной СЭС:

— Калі разглядаць гэту праблему з пункту погляду ўздзеяння на прыроду, то пра гэта гаварыць яшчэ рана. Калі ж улічваць уздзеянне на здароўе людзей, то экалагічная сітуацыя, якая склалася, дае права пра гэта гаварыць.

ДУДКО А. Т. — дырэктар ВА «Гомелькабель»:

— Магчыма. Таму што не прымаецца дастаткова мер па барацьбе з радыяцыйным забруджаннем, уплыў жа на акаляючае асяроддзе прамысловых прадпрыемстваў не страшны, таму што яго можна паправіць.

СТАРАСЦЕНКА М. П. — дырэктар кінатэатра імя Калініна:

— Яна адбылася з-за аварыі на Чарнобыльскай АЭС і ўздзеяння прамысловых прадпрыемстваў.

СОРЫН М. Ю. — член нефармальнага аб'яднання «Зялёны ліст», настаўнік фізікі СШ № 51:

— Катастрофа ў наяўнасці, таму што меры, накіраваныя на ліквідацыю вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, мізэрныя і малаэфектыўныя. Хварэюць дзеці і дарослыя.

ЯРЧАК М. М. — нам. старшыні аблвыканкома:

— Немагчыма, таму што на Гомельшчыне жывуць дастаткова разумныя людзі і яны гэтага не дапусцяць.

Прахожая:

— Яна адбылася ўжо. Гэта аварыя на Чарнобыльскай АЭС, і нам страшна за нашых дзяцей.

Берегите эти земли,
эти воды,
Даже малую былиночку любя.
Берегите всех зверей
внутри природы,
Убивайте лишь зверей
внутри себя.

Е. ЕВТУШЕНКО.

«ЭКАЛОГІЯ І ЗДАРОЎЕ»

Такая назва агляду-конкурсу нагляднай агітацыі на прыродаахоўную тэматыку, які правёў Гомельскі абласны Цэнтр здароўя. Мэта яго — далейшае ўдасканаленне прапагандысцкай работы па фарміраванню здаровага ладу жыцця, паляпшэнне экалагічнай адукацыі насельніцтва.

Дыяпазон прадстаўленых на агляд-конкурс плакатаў быў даволі шырокі. Яны адлюстроўвалі пытанні аховы навакольнага асяроддзя, здароўя маці і дзіцяці, харчавання і інш. Асабліва каштоўнае, як лічаць арганізатары агляду, выкарыстанне мясцовых матэрыялаў, што адлюстроўваюць праблемы гарадоў і раёнаў нашай вобласці.

Актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні конкурсу прымалі абласны аддзел аховы здароўя, абком прафсаюза медыцынскіх работнікаў, абласное таварыства Чырвонага Крыжа, вытворчае аб'яднанне «Фармацыя», санэпідстанцыя.

І, мабыць, таму, што было там шмат зацікаўленых арганізацый, высокай аказалася і актыўнасць удзельнікаў агляду-конкурсу.

— Конкурс перавысіў нашы спадзяванні, — сказала пры падвядзенні яго вынікаў галоўны ўрач абласнога Цэнтра здароўя Т. М. Шаршакова. — Мы нават не чакалі, што будзе прадстаўлена так многа добрага матэрыялу. Асаблівай увагі заслугоўвае тое, што ў конкурсе прынялі ўдзел не прафесіяналы-мастакі, а медыцынскія работнікі.

Пераможцы конкурсу ўзнагароджаны Дыпломамі Беларускага таварыства аховы прыроды, граматамі, прэміраваны.

А што іх работы? Ім прадстаіць яшчэ доўгае жыццё. Пазней ідэі, закладзеныя ў матэрыялах агляду-конкурсу, знаходкі, якія выкарыстоўваліся для іх увасаблення, стануць арыенцірам у далейшай рабоце. Цяпер рыхтуецца выстаўка лепшых работ з удзелам абласнога таварыства аховы прыроды. На аснове матэрыялаў будуць выдадзены плакаты.

Т. САКАЛОВА,
рэдактар Гомельскага абласнога Цэнтра здароўя.
Н. БЕЛЬЧАНКА,
інструктар абласнога таварыства прыроды.

ПАРАДЫ:

ЯК АБАРАНІЦЬ НАВАКОЛЬНАЕ АСЯРОДДЗЕ І ВАША ЗДАРОЎЕ

● Менш карыстайцеся гарадскім транспартам, больш хадзіце пехатой. Гэта больш танна і карысна для здороўя.

● Павышаны шум можа аказаць шкоднае ўздзеянне на ваш слых і нярвовую сістэму. Падумайце аб акаляючых, перш, чым пачнеце ганяць рухавік вашага матацыкла або павялічыце гучнасць вашай стэрэасістэмы або тэлевізара.

● Сачыце за чысцінёй вашага горада. Кідайце акуркі ў урну.

● Утрымлівайце ваша жыллё ў добрым стане.

● Не ўстройвайце туалеты і выграбныя ямы паблізу крыніц вады. Рэкамендуемая адлегласць — 50 м.

● Пры выкарыстанні пестыцыдаў азнаёмцеся з інструкцыяй, захоўвайце рэкамендуемую канцэнтрацыю. Не выкарыстоўвайце меркі або пустыя кантэйнеры для іншых мэт.

● Захоўвайце пестыцыды і гербіцыды ў месцах, недаступных для дзяцей, прасачыце за тым, каб яны не гулялі ў нядаўна апрацаваных месцах.

● Перад распыленнем пестыцыдаў або гербіцыдаў апраніце лёгкае адзенне, якое б закрывала па магчымасці ўсё цела.

● Не апыляйце ўраджай пры моцным ветры. Пестыцыды могуць быць аднесены на людзей, жывёл, жылыя памяшканні, размешчаныя паблізу. Не дапускайце людзей і жывёл у толькі што апыленыя месцы.

● Старанна мыйцеся пасля работы з гербіцыдамі, здыміце забруджанае адзенне перад тым, як прыйсці дадому. Свежаапылены ўраджай есці нельга.

● Не перасыпайце пестыцыды або гербіцыды голымі рукамі, не апускайце рукі ў вадкасць для перамешвання.

● Эканомце энергію — выключайце непатрэбныя ў даны момант электрапрыборы, лепш апраніце цёплае адзенне, чым уключаць электраабагравальнік. Чым менш электраэнергіі вы выкарыстаеце, тым менш двуокісу вугляроду выдзяляецца ў атмасферу.

● Не курыце ў закрытым памяшканні. Запомніце: пасіўнае курэнне можа быць шкодным для ўсёй сям'і. Курэнне небяспечна для вашага здароўя!

● Сачыце за тым, каб сырыя прадукты не дакраналіся да прыгатаваных. Гэта — прафілактыка харчовых атручванняў. Заўсёды, як след, тэрмічна апрацоўвайце ўжо прыгатаваную ежу.

● Утрымлівайце рабочыя паверхні сталоў на кухні і саму кухню ў чысціні. Мыйце апрацоўваючыя дошкі і прыборы кожны раз пасля іх выкарыстання для розных прадуктаў. Гэта — прафілактыка перакрыжаванага і паўторнага забруджвання.

● Прадукты, якія захоўваюцца не ў халадзільніку, павінны быць закрыты ад насякомых, грызуноў і інш.

● Пастэрызаванае малако больш бяспечнае для ўжывання, чым сырое. Сырое малако абавязкова пракіпяціце перад ужываннем.

● Трымайце смецце ў закрытых вёдрах.

● Не трымайце ядавітыя рэчывы ў кантэйнерах для прадуктаў або напіткаў, а таксама пустых бутэльках з-пад віна або прахаладжальных напіткаў. Захоўвайце лякарствы і хімічныя рэчывы далей ад дзяцей.

Адказная за выпуск — галоўны ўрач абласнога Цэнтра здароўя Т. М. ШАРШАКОВА.

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 3-11, тэл. 57-16-52.

«Гомельскі універсітэт» — орган парткома, рэктората, профсоюзных комитетов, комитета ЛКСМБ Гомельского государственного университета. Гомельская фабрика «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1.

Аб'ём — 1 друк. арк. Тыраж 2000 экз. Заказ 97.